УДК 811.161.3 (091)

Студ. В.Л. Неўдах
Навук. кір. заг. кафедры В.У. Русак (кафедра беларускай філалогіі, БГТУ)

# ГІСТОРЫЯ ЎЗНІКНЕННЯ ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ

21 лютага жыхары ўсяго свету святкуюць Дзень роднай мовы. Мэтамі свята з’яўляецца садзейнічанне моўнай і культурнай разнастайнасці, абарона знікаючых моў і прызнанне ўсіх моў аднолькава каштоўнымі. Гэты дзень важны для спецыялістаў, якія вывучаюць і перадаюць веды аб мове, а таксама для людзей, якія цікавяцца мовамі.

Задачы даследавання: правесці пошук інфармацыі па пытаннях узнікнення і прыныцця Дня роднай мовы (разглядзець перадумовы і прычыны трагедыі 21 лютага 1952 г., якая адбылася падчас барацьбы за статус бенгальскай мовы), даведацца пра мерапрыемствы ўшанавання, праведзеныя пасля трагедыі, і пра мэты абвяшчэння Дня роднай мовы на канферэнцыі ЮНЕСКА.

Дата свята Дня роднай мовы прымеркавана да памяці аб трагедыі, якая адбылася ў Бангладэшы 21 лютага 1952 г. Перадумовы трагедыі бяруць пачатак з 1947 г., калі сучасны Бангладэш быў часткай Пакістана – правінцыяй Усходні Пакістан. Усходні і Заходні Пакістан вельмі моцна адрозніваліся па мове і культуры. Ва Усходнім Пакістане пераважнай мовай была бенгальская, у Заходнім – урду. Ключавая рэзалюцыя адукацыйнага саміта ў Карачы змяшчала прапанову зрабіць урду адзінай дзяржаўнай мовай краіны, а таксама адзінай мовай СМІ і адукацыі. Гэта выклікала масавыя пратэсты. Студэнты з Дакі выйшлі на дэманстрацыі, патрабуючы прыняцця бенгальскай мавы афіцыйнай мовай дамініёна і дазволу выкладаць на ёй у адукацыйных установах Усходняй Бенгаліі. Нягледзячы на гэта, федэральная камісія выкрасліла бенгальскую мову са спісу дазволеных прадметаў навучання і выдаліла яе з пячатак і грашовых знакаў. Міністр адукацыі Фазлур Рахман актыўна праводзіў падрыхтоўку да аб’яўлення урду адзінай дзяржаўнай мовай Дамініёна Пакістан. Грамадскасць была ўгневана. Студэнты Дакскага ўніверсітэта сустрэліся на сходзе 8 снежня 1947 г., дзе афіцыйна запатрабавалі надання бенгальскай мове статусу дзяржаўнай. Па г. Дака прайшлі арганізаваныя студэнтамі працэсіі і мітынгі.

У 1948 г. урду была аб’яўлена ўрадам адзінай дзяржаўнай мовай на ўсёй тэрыторыі краіны, а дэманстрацыі ў падтрымку бенгальскай мовы былі забаронены. Падняўся рух за дзяржаўны статус бенгальскай мовы. 31 студзеня 1952 г. на сустрэчы ва ўніверсітэце Дакі быў сфарміраваны «Цэнтральны камітэт па моўных пытаннях». Прапанова

запісваць бенгальскую мову арабскім пісьмом, вылучаная ўрадам, была з абурэннем адвергнута. Камітэт прызначыў усеагульны вулічны пратэст на 21 лютага. Студэнты сабраліся каля Дакскага ўніверсітэта 4 лютага і запатрабавалі ва ўрада адмяніць прапанову аб арабіцы, а таксама настойвалі на прызнанні бенгальскай мовы. Усходнепакістанскія студэнты-бенгальцы распачалі масавыя пратэсты супраць абвяшчэння урду дзяржаўнай мовай Пакістана, нягледзячы на перавагу ў краіне носьбітаў бенгальскай мовы. 21 лютага 1952 г. актывісты руху былі расстраляныя пакістанскай паліцыяй, якая адкрыла агонь па дэманстрантах, у выніку чаго некалькі чалавек загінулі.

23 лютага студэнты з Медыцынскага каледжа ўзвялі часовы помнік на месцы масавага забойства ў гонар тых, хто трагічна загінуў. Узвядзенне мемарыяла было скончана 24 лютага. 26 лютага помнік разбурыла паліцыя.

Праз два гады пасля знішчэння помніка ахвярам быў створаны новы помнік. Архітэктар Хамідур Рахман пачаў працу над ім у 1957 г. пры падтрымцы Аб'яднанага фронту. Адкрыццё помніка было праведзена 21 лютага 1963 г., ён прастаяў да 1971 г. Пакістанскія войскі знішчылі мемарыял падчас вядомай аперацыі «Пражэктар», але праз два гады помнік зноў быў адноўлены.

17 лістапада 1999 г. Генеральная канферэнцыя ЮНЕСКА аб'явіла 21 лютага Міжнародным днём роднай мовы. Першыя мерапрыемствы прайшлі 21 лютага 2000 г. у штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы. Генеральная Асамблея ААН падтрымала ініцыятыву аб абвяшчэнні свята ў 2002 г. у рэзалюцыі, якая заклікала краіны-члены садзейнічаць захаванню і абароне моў народаў свету.

Кожны год 21 лютага праводзяцца асветніцкія лекцыі, канферэнцыі, семінары. Праходзяць акцыі па абароне дзяржаўнай мовы. У штаб-кватэры ЮНЕСКА і ў яе філіялах праводзяцца выставы і прэзентацыі, якія прысвячаюцца мовам, арганізуюцца святочныя канцэрты. У адукацыйных установах праходзяць тэматычныя заняткі. Праводзяцца конкурсы сярод знаўцаў роднай мовы. У сродках масавай інфармацыі публікуюцца артыкулы аб жывых і знікаючых мовах.

Такім чынам, на абвяшчэнне Дня роднай мовы паўплывалі палітычныя падзеі 1947–1952 гг., якія адбываліся на тэрыторыі Пакістана і Бангладэша. У цяперашні час, адзначаючы Міжнародны дзень роднай мовы, людзі аддаюць павагу не толькі вялікай колькасці моў, якія існуюць у свеце, і культурам, якія яны адлюстроўваюць, але і ахвярам трагедыі, якая адбылася 21 лютага 1952 г.